**ВІТКА** Васіль (Крысько Цімох Васільевіч) [16. 05. 1911, в. Еўлічы Слуцкага р-на, Мінскай вобл. – 10. 07. 1996], пісьменнік, педагог.

Пасля заканчэння Слуцкай прафтэхшколы працаваў на будаўніцтве Бабруйскага лесакамбіната. У гады Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнічаў у газеце “Советская Белоруссия”, у сатырычным часопісе “Партызанская дубінка”, у газеце-плакаце “Раздавім фашысцкую гадзіну”. У пасляваенны час працаваў галоўным рэдактарам газеты “Літаратура і мастацтва”, (1951–1956), часопіса “Вясёлка” (1957–1974).

В. Вітка напісаў шмат твораў для дзяцей. Шырокай вядомасцю карыстаюцца яго зборнікі вершаў “Вавёрчына гора” (1948), “Буслінае лета” (1958), “Казка пра цара Зубра” (1960), “Зайчык-вадалаз” (1962), “Дударык” (1964), “Азбука Васі Вясёлкіна” (1965), “Мы будуем метро” (1969) і інш.

У 1972 годзе кнігі В. Вітка “Чытанка-маляванка”, “Беларуская калыханка” і “Казкі” ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей.

Уся творчасць В. Віткі цесна звязана са школай, з праблемамі выхавання дзяцей і моладзі, узаемаадносін бацькоў і дзяцей. Свой роздум аб выхаванні дзяцей ў школе і сям’і, трывогу аб будучыні грамадства і сваё аўтарскае бачанне свету пісьменнік таленавіта выказаў у шэрагу артыкулаў, замалёвак-мініяцюр, дзённікавых запісаў і ўспамінаў, якія склалі змест яго кніг “Дзеці і мы” (1977), “Урокі” (1982), “Азбука душы” (1988).

В. Вітка – сааўтар падручніка “Роднае слова” для 2 класа (з М. Шаўлоўскай, 1987, 1989, 1991, 1993, 1995, 1996), для 3 класа (з М. Шаўлоўскай, 1988, 1990), для 1 класа (з М. Шаўлоўскай, 1998).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ